

## “НА КРЫЛАХ МАРЫ” — ПЕРШЫ ЎЗМАХ

Рэспубліканскае свята выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі ля сталічнага Палаца спорту сталася яркім падарункам моладзі. Каля 5 тысяч чалавек з усіх рэгіёнаў, якія маюць дасягненні ў вучобе, грамадскай дзейнасці, спорце, культуры і дабрачыннасці, сабраліся на сустрэчу з удзелам Прэзідэнта. Гэтым разам традыцыйны баль крэатыўна перайначылі, зрабілі больш нефармальным. Гасцей чакала канцэртная праграма “На крылах мары” з удзелам маладых артыстаў, воднае шоу, феерверк і дыскатэка пад адкрытым небам.



**Яраслаў Ціханенка,** выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— Такая дзея сёлета адбылася ўпершыню: свята выпускнікоў набыло новы фармат. Ідэя дакладна класная. Магу гэта сказаць смела, маючы вопыт працы на рознага кшталту мерапрыемствах і праектах. Так, ёсць задумы, што можна яшчэ зрабіць у будучыні, аднак курс, бясспрэчна, абраны правільны. Маштабная пляцоўка, цікавыя хады ў сцэнарыі... Уражанняў хопіць на год уперад!